Каму верыць, паважаныя? Або лепш не верыць і не прасіць? Схіляюся да апошняга. Каб потым не крыўдаваць.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

МТЗ павялічыў вытворчасць трактароў

Мінскі трактарны завод у студзені — верасні бягучага года павялічыў вытворчасць трактароў на 31,4 працэнта, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, да 26.294 штук.

Як патлумачылі спецыялісты завода, рост вытворчасці забяспечаны дзякуючы пашырэнню наменклатуры і павышэнню попыту на беларускія трактары за мяжой. За межамі рэспублікі МТЗ рэалізуе каля 80 працэнтаў трактароў.

У 2003 годзе завод выпусціў 26.877 трактароў, што на 9 працэнтаў больш, чым у 2002 годзе.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

ТАК БЫЛО...

Брыдкі ўчынак раз'юшанага ахоўніка

Некалькі журналістаў замежных СМІ пацярпелі падчас разгону вулічнай акцыі ў цэнтры Мінска ўвечары 19 кастрычніка. Былі жорстка збітыя АМАПам аператары расійскіх тэлеканалаў НТБ і REN-TV (тэлекамеру НТБ міліцыя разбіла), раней на маіх вачах быў незаконна затрыманы фотакарэспандэнт агенцтва "Асашыэйтэд Прэс" Сяргей Грыц. Мне дасталося менш за ўсіх — на фоне брутальнасці так званых ахоўнікаў парадку ў дачыненні да іншых я, можна сказаць, атрымаў падарунак.

Пасля таго як міліцыя схапіла і зацягнула лідэра АГП Анатоля Лябедзьку ў памяшканне рэстарана "Патыё піца" на праспекце Скарыны, туды здолелі прарвацца аператары НТБ і REN-TV Канстанцін Марозаў і Уладзімір Косцін. Абодва сказалі, што амапаўцы паклалі журналістаў на падлогу і "не давалі падняць галавы": білі па камерах, але і ім, журналістам, таксама дасталося, атрымалі цялесныя пашкоджанні. Камеру НТБ міліцыя разбіла. Пасля гэтага журналістаў выкінулі на вуліцу, і я падышоў да Косці Марозава — на ягоным ілбе была кроў.

Калі я запісваў інтэрв'ю з аператарам НТБ, раптам убачыў, што за ім стаіць супрацоўнік службы бяспекі Аляксандра Лукашэнкі, імя якога Сяргей. Літаральна за два дні да таго ён жартаваў з Марозавым у зале Палаца Рэспублікі, чакаючы прэс-канферэнцыі Лідзіі Ярмошынай. Шмат якія журналісты добра ведаюць гэтага ахоўніка — ён заўсёды круціцца каля прэсы, і не толькі там, дзе Лукашэнка, але і, напрыклад, у такіх выпадках, як галадоўка на кватэры дэпутата Фралова. Паўстае пытанне: што трэба было там рабіць лукашэнкаўскаму ахоўніку? Няўжо галадоўка пагражала бяспецы прэзідэнта?



Ахоўнік, ад якога пацярпеў журналіст Юрый Свірко.

Можна спрачацца пра патэнцыяльную пагрозу акцыі 19 кастрычніка. Але, скажыце, што павінен быў зрабіць гэты Сяргей, убачыўшы, што б'юць вядомых яму журналістаў? Паказаць АМАПаўцам сваё пасведчанне і вызваліць тэлеаператараў. Ён жа паводзіў сябе як шпік, "ціхар", стоячы ў самым цэнтры натоўпу.

Калі я ўбачыў, што ён яшчэ і ўсміхаецца ў сваёй звычайнай з'едлівай манеры, то вырашыў падсунуць яму дыктафон і папрасіць пракаментаваць сітуацыю.

У рэшце рэшт мне быў патрэбны пункт погляду на тое, што адбываецца.

Што зрабіў бы на месцы Сяргея сапраўдны прафесіянал? Сказаў бы, што не мае да пабоішча дачынення, выказаў бы спачуванне параненым тэлеаператарам і дадаў, што ўлады разбяруцца ў сітуацыі. Альбо заявіў бы, што я памыліўся, пераблытаў яго з кімсьці ды спакойна сышоў з месца падзеі.

Але ахоўнік замест адказу моцна ўдарыў мяне ў жывот. Людзі, што стаялі побач, паспрабавалі стрымаць раз'юшанага службіста, але той, ударыўшы адну з дзяўчын, збег у бок прэзідэнцкай рэзідэнцыі. Адзін мой калега, назіраючы за сітуацыяй, пракаментаваў так: "Першая перамога дэмакратыі — народ пабіў ахоўніка Лукашэнкі. Неўзабаве той таксама будзе драпаць, але не ў рэзідэнцыю, а адтуль".

Не ведаю. У рэзідэнцыі не быў гадоў пяць — туды мяне даўно перасталі пускаць, нягледзячы на акрэдытацыю МЗС і на Закон аб друку. Дарэчы, рукі "ахранкі" дацягнуліся і да іншых будынкаў. Гэты ж супрацоўнік прэзідэнцкай аховы — Сяргей — не пускаў незалежных журналістаў на чэрвеньскае пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў, дзе абмяркоўваліся папраўкі да Выбарчага кодэкса. Тады, 22 чэрвеня 2004 года гэты самы ахоўнік на вачах у кіраўніка рабочай групы па Беларусі ПА АБСЕ Уты Цапф знішчыў запісы ў маім дыктафоне і ўдзельнічаў у гвалтоўным выдаленні мяне з будынка парламента, пра што падрабязна пісала "Народная воля".

Тады я звярнуўся са скаргай на імя генпракурора Беларусі, але атрымаў ліст, у якім паведамлялася, што скарга "накіравана ў Службу бяспекі Прэзідэнта, адкуль Вы атрымаеце адказ". Адказу адтуль я дагэтуль не атрымаў, таму прашу аб'яднаць гэтыя два эпізоды — чэрвеньскі і кастрычніцкі — у адну крымінальную справу па артыкуле Крымінальнага кодэкса аб незаконным супрацьдзеянні працы журналіста.

Калі гэтага не будзе зроблена, будзе абсалютна дакладная падстава сцвярджаць, што генпракурор Шэйман пакрывае злачынцаў, бо тыя набліжаныя да Лукашэнкі.

Юрый СВІРКО, журналист.

Василий ШЛЫНДИКОВ,
председатель Ассоциации содействия экономическому развитию:

«Так нагло нас еще не «кидали»...

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

— В чем Вам видится причина откровенного безразличия людей?

— Людей настолько запугали, что они и в самом деле поверили в то, что все их действия бесполезны и не могут ни на что повлиять. И, во-вторых, они просто не верят в эти выборы, не верят в возможности этого "парламента". И хотя люди довольно активно шли на участки, я видел, что они в основном хотят высказаться "за" или "против" на референдуме, выборы в "палатку" их интересовали постольку-поскольку. Этот референдум затронул все же людей, и на участке №154, по моим наблюдениям, только около трети людей проголосовало "за". Хотя к концу дня результаты стали противоположными.

— А подробнее...

— Сначала оказалось, что 62% избирателей проголосовали предварительно. Вы можете себе такое представить? Я не могу. До подсчета голосов мы ясно видели, что стопка "за" — очень маленькая, максимум треть, все остальные — против, против, против, непристойные даже надписи в адрес власти на бюллетенях. Причем в графе "против" проставлены жирные значки, — чувствуется, люди вкладывали в процесс голосования все свои эмоции, чаще всего негативные... Мы это все видели. Председатель комиссии Скоб Александр Яковлевич пытался все время нас "приструнить" — отойдите, мол, подальше, сядьте за свои столы... Я видел, как раскладка шла, как складывалась борьба за депутатское место у Богданкевича с кандидатом от власти — примерно равные стопки бюллетеней. Вот в комиссии уже раздаются голоса: пролетает Лукашенко с референдумом. Каждый член комиссии пишет результат на бумажку, начинается подсчет, — тех, кто "за" — гораздо меньше, чем тех, кто "против". Все бумажки несут председателю, он долго считает и... объявляет совершенно противоположные цифры. Все наоборот!

Члены комиссии подписывают протокол, дают нам копии, где видно, что победа отдается главврачу Коропу уже в первом туре, а Лукашенко поддержало якобы большинство. Наблюдатели эмоционально выкрикивают в адрес председателя комиссии: "Что вы делаете?", "Зачем вам это надо?", "Кому вы хотите угодить этим?" Он в ответ лишь прячет глаза. Предлагаем ему, — давайте пересчитывать бюллетени. А он в ответ — а бюллетени уже увезли.

Вот так все было.

— Они что, не понимают сути происходящего? Ведь за преступление рано или поздно придется нести ответственность...

— Эти милые женщины с "Белтрансстроя" (члены комиссии) сказали в оправдание, что мы, мол, не видели, как он, председатель комиссии, считал голоса. А мужики, члены комиссии, вообще стали молча и пряча глаза расходиться. Стыдно! Я их спрашиваю, вы разве не видели, что большинство сказали на референдуме "нет!" Молчат, глаза долу. И все! Они фактически подтвердили те цифры, которые им спустили сверху, не думая об ответственности, а думая, видимо, только о том, чтобы их похвалило начальство.

— Или чтоб не уволили?

— Но ведь можно было и не идти в комиссию. Зачем они соглашались идти в комиссии, если понимали, что придется врать, кривить душой?.. А ведь с виду они все люди совсем неплохие — нормальные, приятные, образованные. Спокойно совершают преступление, не задумываясь о последствиях, о том, как это отразится на судьбе их детей, внуков.

— Если попробовать охарактеризовать одним предложением прошедший референдум и выборы, то, скажите, что это было?

— Спектакль, который поставила власть, использовав народ в качестве массовки. Людей жалко. Жалко тех, кто спешил на выборы, бежал стремглав, думая, что его или ее голос нужен Беларуси, что их мнение кто-то услышит. Бежали студенты, молодые матери до позднего вечера. Никому этот их голос оказался не нужен, все уже посчитали заранее наверху. Наших людей просто нагло использовали. Использовали и забыли. Ясно, что выборов и референдума у нас 17 октября не было. С такой беспардонной наглостью, я, как человек, проживший больше пятидесяти лет на белом свете и занимавший высокие должности, никогда ранее не сталкивался. Так нагло нас еще не "кидали". Просто "кидалы" — наперсточники какие-то!

— Лидия Ермошина, председатель Центризбиркома, тем не менее заявила на итоговой пресс-конференции, что "референдум объединил нацию". Вы согласны с ней?

— Конечно же, нет. Я думаю, что все произошло в точности наоборот. Референдум максимально поляризовал нацию: с одной стороны — противники Лукашенко, с другой — чаще всего агрессивные сторонники. Референдум обострил ненависть у людей. Такого не было раньше. На выборах 1995 года спорили, даже ругались: одни доказывали, что социализм — это лучше, чем капитализм, другие — наоборот. Но с неприкрытой ненавистью в те годы я не сталкивался.

— Мало кто верит, что все без исключения оппозиционные кандидаты проиграли выборы в "палату". Хотя, по данным Ермошиной, именно так и произошло. Неужели даже один оппозиционер в парламенте мог бы, как говорится, сделать погоду?

— Я Лукашенко уже давно не понимаю и никаких логических цепочек в его действиях не ищу. Если бы я был авторитарным правителем *(смеется)*, я бы поступил совсем по-другому и пропустил бы десяток оппозиционеров в парламент. Давайте задумаемся: что такое оппозиция? Это — бесплатная рецензия всех твоих решений. Оппозиция бесплатно говорит тебе, где плохо, а где — хорошо. Но ему даже это не надо.

— Возможно ли, на Ваш взгляд, бороться с Лукашенко при помощи выборов?

— Нет, невозможно. Выборы в полном смысле этого слова при власти Лукашенко в Беларуси — невозможны. Ни сейчас, ни в будущем.

Беседовал Александр СИЛИЧ.

В тему

Власть изнасиловала Белорусов

То, что произошло в Беларуси 17 октября, я думаю, можно определять только ненормативной, уголовной лексикой. Власть в течение 40 дней с помощью своих телевизионных, радио-, вертикальных, избиркомовских и других холуев фактически насиловала белорусов. И в итоге нагло и цинично их "поимела". А демократическая оппозиция не смогла в очередной раз защитить белорусов от большой беды. Она, оппозиция, заглотнула брошенную властью приманку, выдвинула своих кандидатов в некую "палатку" и "блестяще", "продуманно", с головой оказалась в полном дерьме.

Ребята, думать надо!

Тамара БЕЛАЯ.

Минск.

ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ

Камунальнікі помсцяць за неплацяжы

Колькасць кватэранаймальнікаў, якія маюць запазыку перад камунгасам ды іншымі ведамствамі, што сілкуюцца за кошт камунальных плацяжоў, пастаянна расце.

За студзень—верасень бягучага года 34 тысячы сем'яў у Віцебскай вобласці мелі запазыку па квартплаце ды камунальных паслугах ад трох месяцаў да некалькіх год.

Для пакарання даўжнікоў камунальнікі пачалі ўжываць жорсткія захады. Да прыкладу, сёлета ў 2816 сем'яў неплацельшчыкаў адключалася вада. 76 спраў аб спагнанні "нядоімак" накіроўваліся ў суды, якія задаволілі 48 іскаў да неплацельшчыкаў на 97 мільёнаў рублёў.

У якасці дзейснага захаду выкарыстоўваецца натарыяльны запіс, паводле якога запазыка ўтрымліваецца прымусова з даходаў — зарплат і пенсій. Такім чынам, з больш як 1000 чалавек сёлета спагнана 316 мільёнаў рублёў.

Але самая страшная помста спасцігае тых, хто затрымлівае разлікі на працягу некалькіх год. Іх, паводле рашэння суда, высяляюць з кватэр, перамяшчаючы ў горшае і меншае жыллё. Такі горкі лёс напаткаў на Віцебшчыне ўжо 23 сям'і. На чарзе — яшчэ 22 аналагічныя судовыя справы.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ЧТО ПРОИСХОДИТ В МИРЕ

Удары мощного тайфуна

По уточненным данным, по меньшей мере 48 человек погибли, 200 получили ранения и 33 считаются пропавшими без вести в результате тайфуна "Токаге", обрушившегося на юго-запад Японии.

Скорость ветра во время прохождения тайфуна достигала 230 километров в час. Кроме того, "Токаге" (в переводе с японского — ящерица) принес проливные дожди, угрозу оползней, нарушил движение транспорта и стал причиной эвакуации тысяч людей. Это уже десятый тайфун, обрушившийся на Японию в этом году, и самый мощный почти за два десятилетия. Более 150 человек погибли в стране от ураганов и циклонов с начала сезона. Некоторые районы Японии, в частности, в префектуре Миядзаки, оказались полностью отрезанными от "большой земли". По данным японской вещательной корпорации Эн-Эйч-Кей, эвакуированы более 110 тысяч человек. Из-за сильных дождей на время было отменено движение сверхскоростных поездов между Токио и Осакой; отменена тысяча внутренних авиарейсов, из-за чего около 127 тысяч пассажиров вынуждены оставаться в аэропортах.

Взрыв на шахте в Китае

На угольной шахте в китайской провинции Хенань произошел взрыв. 56 человек погибли, еще 100 считаются пропавшими без вести. Когда произошел взрыв, в шахте работали свыше 400 горняков. 148 шахтеров оказались блокированы под землей. Каждый год в Китае, несмотря на обещания правительства повысить уровень безопасности работ в горнодобывающей промышленности, гибнут тысячи шахтеров.

Фидель Кастро поскользнулся и упал

Кубинский президент Фидель Кастро получил травмы, упав после выступления в городе Санта Клара.

Полагают, что он поскользнулся на ступенях мавзолея, где захоронен Че Гевара. После этого Кастро выступил по кубинскому телевидению и рассказал зрителям, что у него, по всей видимости, небольшие трещины в колене и руке. В кадре он сидел в кресле, было видно, как он сильно потел. О здоровье кубинского лидера в последнее время говорят часто. Сейчас ему 78 лет. Три года назад во время митинга он потерял сознание.

На МКС починили систему по производству кислорода

Космонавты, работающие на Международной космической станции, починили систему по производству кислорода "Электрон". Как сообщает агентство "Интерфакс", по словам представителя Центра управления полетами, "в течение прошлых месяцев система давала сбои несколько раз, и специалисты пытались установить причину".

"Наконец, было установлено, что был забит клапан сброса водорода за борт. Теперь космонавты устранили эту неисправность, и система работает нормально", — рассказал он.

В данный момент на станции работают два экипажа — Геннадий Падалка и Майкл Финк из 9-й экспедиции и Салижан Шарипов и Лерой Чиао из 10-й экспедиции, а также прибывший с короткой миссией посещения на орбиту первый космонавт космических войск Юрий Шаргин.

ЭХО

Йошка ФИШЕР, министр иностранных дел ФРГ:

«Выборы не были честными и свободными...»

Министр иностранных дел ФРГ Йошка Фишер заявил, что парламентские выборы в Беларуси, а также референдум, результаты которого позволяют президенту Александру Лукашенко баллотироваться на третий срок, нельзя считать ни свободными, ни справедливыми. Фишер сказал, что правительство ФРГ озабочено заключением ОБСЕ о нарушениях в ходе голосования.

«ВАШИНГТОН ПОСТ»:

«За десять лет своего правления Лукашенко снискал репутацию последнего диктатора Европы»

О президентских выборах и референдуме в Беларуси читателей информируют многие ведущие издания. США. Обстоятельно анализирует ситуацию **"Вашингтон пост".** Газета посвятила этой теме редакционную статью. "Мало кто из западных наблюдателей ожидал, — говорится в ней, — что состоявшиеся выборы будут свободными и честными. Так что их результатам удивляться не приходится. А объявленные результаты таковы: правительственным партиям достались все парламентские мандаты. По итогам референдума, Александр Лукашенко фактически становится президентом пожизненно".

"За десять лет своего правления Лукашенко снискал репутацию последнего диктатора Европы, — пишет газета. — Он несколько раз проводил сомнительные выборы и последовательно избавлялся от свободных СМИ, независимых общественных организаций и лидеров оппозиции. К тем же методам он прибег и во время последней предвыборной кампании. Согласно официальным данным, за изменение Конституции проголосовали 77% избирателей. По данным опроса независимой организации Гэллапа, в действительности эту выдвинутую Лукашенко идею поддержали менее 50% участников референдума. Это дает основание администрации президента Буша и европейским правительствам занять единую позицию".

«ТАГЕСЦАЙТУНГ»:

«Следует отмежеваться от псевдозаконного белорусского руководства»

Немецкая газета **"Тагесцайтунг"** отмечает:

Автократ Лукашенко мог бы спокойно обойтись без этой дешевой комедии. Брюсселю и другим западноевропейским столицам теперь следует подумать, как им дальше обращаться с Беларусью. Само собой разумеется, что следует отмежеваться от псевдозаконного белорусского руководства. Впрочем, вряд ли это произведет какое-либо впечатление на Лукашенко, все более утрачивающего чувство реальности. Однако только этим политика не должна ограничиваться. Необходимо также сосредоточить свое внимание на силах, представляющих иную Беларусь. Как правило, это молодые люди, выступающие за права человека и демократию. Отказать им в поддержке было бы непростительно.

«ШТРАУБИНГЕР ТАГБЛАТТ»:

«В сохранении нынешнего скандального положения в Беларуси заинтересовано еще одно лицо...»

Тему продолжает газета **"Штраубингер Тагблатт":**

Как реагировать Европе на фарс с выборами в Беларуси? Может ли она себе позволить не замечать того факта, что прямо у ее новой восточной границы последний остающийся у власти большевик на глазах у западных наблюдателей с помощью организованного обмана цементирует свою власть? Кроме самого диктатора, в сохранении нынешнего скандального положения в Беларуси заинтересовано еще одно лицо — Владимир Путин.

Трудный выбор Украины: к России или к Европе?

Украина на пороге важнейшего события — президентских выборов. Они пройдут 31 октября. Их результаты будут решающими для будущего страны и дадут ответ на вопрос, станет ли Украина ближе к Европе или к России.

Основных претендентов на самое высокое кресло двое — выдвиженец нынешней номенклатуры, премьер-министр Виктор Янукович и лидер оппозиции Виктор Ющенко. Говорят, что первый — промосковский кандидат, второй — прозападный.

Кампания омрачена слухами о нападениях на ведущих кандидатов в президенты и нечистоплотностью прессы. Виктор Ющенко, выписавшись из венской больницы, где проходил лечение после сильного отравления, выступил перед тысячами своих сторонников на митинге в Киеве и фактически обвинил власти в попытке покушения на его. Глава его избирательного штаба заявил, что *"есть достаточно оснований говорить не просто об отравлении Ющенко и даже не о сильном отравлении, речь идет о покушении на жизнь кандидата в президенты".* Би-Би-Си сообщает, что австрийские врачи не подтвердили версию о покушении, но назвали ее возможной.

Позже премьер-министр Украины Виктор Янукович был госпитализирован, после того как на предвыборном митинге в него бросили тяжелым предметом. Это случилось, когда он выходил из автобуса около университета в городе Ивано-Франковск. Его помощники обвинили в нападении "радикальные элементы" из оппозиции, возглавляемой соперником Януковича Виктором Ющенко.

Днями разгорелся очередной скандал. Депутаты, поддерживающие президента Леонида Кучму, потребовали, чтобы основной оппозиционный кандидат Виктор Ющенко извинился за свои высказывания о том, что власти пытались его отравить. Ранее взрывом во Львове было повреждено здание, где располагалась организация, поддерживающая Ющенко.

Би-Би-Си напоминает, что американское посольство в Киеве выразило протест против использования символики США и портретов президента Джорджа Буша в ходе президентской кампании в Украине. Многие плакаты в сатирической форме представляли Виктора Ющенко как ставленника США, на них оппозиционный кандидат изображен на фоне американского флага, а в некоторых случаях за него якобы "агитирует" президент Джордж Буш. Этим пытаются доказать, что Запад стремится навязать Украине свою политику.

Наблюдатели называют Виктора Ющенко прозападным реформатором, настроенным на интеграцию Украины в Европу и НАТО. Ему противопоставляется Виктор Янукович, который не раз призывал развивать отношения с Россией и уже заручился поддержкой Кремля. Как говорят некоторые эксперты, во время президентской кампании в Украине противники Виктора Ющенко пытаются представить его как марионетку Запада. Однако сам кандидат неоднократно говорил, что намерен выстроить сбалансированную внешнюю политику, которая бы предполагала равноправные отношения и с Западом, и с Россией. Ющенко также подчеркивает, что считает Москву ближайшим партнером Киева, однако видит будущее Украины в Европе.

Кстати, это отмечается и в статье постоянного обозревателя американской газеты **"Сан-Хосе меркьюри ньюс"** Дэниэла Снайдера. *"Исход выборов в Украине имеет большое значение для США, — отмечает обозреватель калифорнийской газеты. — Предвыборная кампания носит бурный, а порой возмутительный характер. Но, пожалуй, самый беспокойный элемент внесло в нее беспардонное вмешательство российского президента Владимира Путина. Наглядной иллюстрацией этого стала демонстрация по телевидению якобы частного банкета по случаю дня рождения Путина, на котором присутствовали президент Украины Леонид Кучма и его преемник Виктор Янукович, выдвинутый самим Кучмой. Путин публично обнимался с обоими и заявлял, что будущее российско-украинских отношений зависит от того, как Украина будет строить свою политику по отношению к России".*

"Москва обеспокоена тем, что лидер реформистской оппозиции Виктор Ющенко может взять курс на ускоренное сближение с НАТО и вступление в Европейский Союз. Однако Ющенко — прагматик, — подчеркивает газета. — *Он понимает, что Россия — крупнейший торговый партнер Украины. Несмотря на то, что российские СМИ пытаются изображать его в виде крайнего националиста, он будет пытаться поддерживать добрые отношения с Россией. Стратегические цели Москвы простираются дальше и направлены на экономическую интеграцию основных бывших советских республик — России, Беларуси, Украины и Казахстана".*

"Москва, — считает обозреватель газеты, — *отошла от своего прежнего геополитического курса на интеграцию с Европой. В нынешнем представлении Кремля должны быть "две Европы" — Европейский Союз и "Евро-Восток" под эгидой России".*

Да, российские газеты и власти проявляют большой интерес к ходу предвыборной кампании в Украине. "Газета" открыто пишет, что Россия хотела бы видеть будущим президентом Украины премьера Виктора Януковича. Приезд Кучмы и Януковича на празднование дня рождения Путина был использован Москвой, чтобы еще раз продемонстрировать свою поддержку нынешнему украинскому премьеру. *"Януковича приняли в Ново-Огарево с таким почетом, как будто день рождения был у него. В поддержку Януковича высказалась украинская диаспора России, а российское правительство пообещало ему отменить ограничения на поставки украинских товаров и ввести упрощенный порядок пересечения границ гражданами",* — отмечает газета.

В свою очередь, Ющенко поддерживают западные политики. Российская газета **"Известия"** пишет: *"Заместитель министра обороны США Пол Вулфовиц заявил о том, что не бывать "свободной и неделимой Европе, пока Украина не станет членом НАТО"...* А вот мнение самого Ющенко: "В Восточной Европе набирает силу призрак безудержного капитализма, советского авторитаризма и даже средневекового феодализма. Перспектива получить целый блок авторитарных, коррумпированных режимов у своих границ должна пробудить политическую элиту и общественность Евросоюза", — писал он в **газете "Интернэшнл Геральд Трибюн".** Как полагает кандидат, "президентские выборы станут кульминацией борьбы между европейским и неевропейским выбором Украины". А потому Запад должен дать четкий сигнал, на чьей он стороне. Вот, видимо, Пол Вулфовиц и послал такой сигнал".

Украинская пресса в эти дни переживает огромное давление. Оппозиция жалуется на неадекватный доступ к электронным СМИ. Редакторы газет, в свою очередь, говорят о спускаемых сверху официальных инструкциях по поводу того, как именно необходимо освещать новости предвыборной кампании. Независимые СМИ жалуются на преследования разного рода — от препонов в аренде помещений до побоев журналистов неизвестными людьми. Все эти жалобы скрупулезно собираются международными наблюдателями.

Би-Би-Си считает, что европейское сообщество, а также США и Канада высказали свои опасения по поводу хода предвыборной кампании в Украине. Согласно опросам общественного мнения, три четверти украинцев называют предвыборную кампанию "грязной" и уверены, что результаты выборов будут подтасованы. Госдепартамент США призвал украинские власти провести честные выборы. Если Украина позволит себе нарушения в ходе избирательной кампании и голосования, Белый дом ограничит поддержку Киева в его стремлении сблизиться с Западом. Уже сейчас, говорится в обращении госдепартамента, Вашингтон "крайне разочарован" разгоном митингов оппозиции, цензурой в СМИ, а также использованием не по назначению государственных средств.

Так что украинцам предстоит сделать тяжелый выбор и в тяжелых условиях информационного давления.

Иван МАКАЛОВИЧ.

БЫВАЕТ И ТАКОЕ

Тыква весом 415 килограммов

Два британских школьника вырастили самую большую в Великобритании тыкву, сообщается на сайте газеты The Guardian. Овощ, который юные садоводы представили на соревновании по выращиванию гигантских тыкв, весит 415 килограммов. Чтобы вынести тыкву из теплицы, где она росла, потребовалась помощь восьми пожарных. Как считает отец одного из школьников, такого успеха они добились благодаря удаче и постоянной заботе. "Мы вместе посадили семена, и ребята постоянно ухаживали за своим растением. Я думаю, что здесь забота гораздо важнее, чем любая наука", — сказал он.

Незадолго до британского рекорда был установлен мировой рекорд в соревнованиях такого рода. Тыква, выращенная в Канаде в этом месяце, весит 656 килограммов.

Ловкий грабитель

Человек в резиновой маске президента США Джорджа Буша ограбил банк в штате Пенсильвания. Вечером в один из банков города Йорка, штат Пенсильвания, вошел мужчина, на котором была надета резиновая маска, лыжная шапочка и перчатки. Он потребовал от кассира отдать ему всю дневную выручку. По свидетельству очевидцев и данным видеонаблюдения, мужчина не угрожал работникам банка и посетителям оружием.

После того как кассир отдал ему деньги, грабитель беспрепятственно покинул операционный зал. В сообщении полиции не уточняется, какую сумму ему удалось украсть. Поиск преступника пока не принес результатов.

Мэри Поппинс не зарегистрировали для участия в выборах президента США

В штате Огайо, США, арестован молодой человек, самостоятельно заполнивший около сотни регистрационных карточек избирателя от имени вымышленных персонажей, сообщает агентство "Associated Press".

22-летний Чад Стейтон был задержан по обвинению в подделке регистрационных карточек. Он заполнял документы, например, от имени волшебной няньки Мэри Поппинс, кинодетектива Дика Трейси, а также спортивных звезд вроде баскетболиста Майкла Джордана или боксера Джорджа Формана и многих других. Стейтон должен был получать плату за каждую карточку, которую с его помощью заполнят избиратели. Полиция подозревает, что с ним расплачивались наркотиками. Женщина, которая нанимала молодого человека на работу, также задержана, в результате обыска у нее дома изъяты пустые бланки карточек избирателя и наркосодержащие вещества.

ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ

Жалезная логіка і горкія слёзы

А было ўсё так. Пенсіянерка з вёскі Калабродцы Ганна Мінак пагодлівым летнім ранкам прыехала ў пасёлак купіць малака, бо карову сваю збыла пяць гадоў таму, калі памёр яе муж Аляксей. І ў магазін, і з магазіна спяшалася: меркавала паспець на бліжэйшы аўтобус, які адпраўляецца назад праз гадзіну. Хвалявалася, што не паспее, бо на хворых нагах не вельмі пабяжыш. І якой жа вялікай была радасць бабулькі, калі ўбачыла на пасадачнай пляцоўцы патрэбны аўтобус. І дзверы адчынены, і вадзіцель ужо сядзіць у сваім крэсле. Беражліва трымаючы ў руцэ пасудзіну з малаком, узабралася па прыступках у салон.

— Вазьміце мяне, калі ласка, да Калабродцаў, — папрасіла шафёра, вінавата апускаючы вочы, што не змагла, не паспела ўзяць у касе білет. Яна хацела дастаць з кашалька грошы, каб заплаціць за білет шафёру, як пачула:

— Выходзьце, бабуля, з аўтобуса. Я ўжо білеты адпісала, і шафёр не мае права браць вас з гэтага прыпынку.

Старэнькая ўбачыла перад сабой маладую жанчыну, якая працавала тут кантралёрам.

Шафёр пацвердзіў, што браць бабулю да Калабродцаў ён не збіраецца: ведамасць закрыта, білеты адпісаны. Час у дарогу. І кантралёр, і шафёр ушчувалі старэнькую, што яна парушае парадак, не спяшаецца пакідаць салон. Бабулька яшчэ раз глянула на пустыя месцы ў аўтобусе, адно з якіх магла б заняць, калі б мела білет. Месцаў гэтых, як на грэх, было многа, але ёй ехаць не дазвалялі. Кантралёр растлумачыла, што ёсць інструкцыя, дзе чорным па беламу напісана: калі аўтобус адпраўляецца ад аўтастанцыі, то шафёр не мае права браць пасажыраў без білетаў і сам прадаваць ім гэтыя білеты.

Ганна Апанасаўна Мінак у роспачы казала, што ёй тэрмінова трэба дабрацца дадому, што яна дзеля таго і ўстала ні свет ні зара, каб як мага хутчэй вярнуцца. А наступны аўтобус будзе толькі праз пяць гадзін.

Яе слухалі, але не разумелі. На баку аўтобуснікаў была жалезная логіка: яны цвёрда трымаліся інструкцыі, не грубілі, правіл не парушалі. Іх, здавалася, і папракнуць няма за што. А старэнькая жанчына спазнілася, не паспела ўзяць білет. Дык няхай і едзе цяпер, чым хоча.

Дык чаму ж на вачах Ганны Апанасаўны закіпелі горкія слёзы, калі яна непаслухмянымі, нібы не сваімі нагамі, (выгналі-такі) выйшла з аўтобуса і, апусціўшы галаву, пайшла на шашу ў надзеі, што раптам знойдзецца добры чалавек і на спадарожнай аўтамашыне давязе яе да вёскі.

Стаяла яна на абочыне асфальту, глядзела, як міма праносіліся легкавушкі і грузавікі, і ўсё ніяк не магла зразумець, за што яе так пакрыўдзілі, за што выгналі з аўтобуса? Яна ж не хацела ехаць задарма, яна ж заплаціла б...

Успомнілася жыццё. Нялёгкае і няпростае, як і ва ўсякага, на чыю долю выпала ваеннае ліхалецце, пасляваенная бясхлебіца. Якой цяжкай была работа на палях, калі не было машын, не хапала коней. І якім танным быў працадзень.

— Хіба ж я не зарабіла, не заслужыла?.. — невядома ў каго пытала жанчына.

Горкая крыўда, пачуццё несправядлівасці так і засталіся ў яе сэрцы. Не зразумела яна і ніколі не зразумее, чаму, дзеля чаго інструкцыя для некаторых службоўцаў стала даражэй за людскія слёзы, перажыванні? Чаму некаторыя развучыліся разумець чужы боль?

А колькі такіх выпадкаў сустрэнеш на аўтастанцыях? Аўтобус адпраўляецца ў рэйс напалавіну пусты, а чалавек не паедзе, бо не паспеў своечасова ўзяць у касе білет, хоць і бег ён да гэтай касы, хоць і спяшаўся. Не паспеў... І ніхто цябе не захоча зразумець, дапамагчы, пашкадаваць. Так, пашкадаваць. Некаторыя разумнікі ў недалёкія, але, будзем спадзявацца, беззваротныя часы дагаварыліся да таго, што жальба абражае чалавека. Вось і дафіласофстваваліся, што жальбу, спагаду, міласэрнасць вытравілі з многіх сэрцаў, замяніўшы іх літарай "інструкцыя". Шкадаваннем, спачуваннем не абразіш, а абрадуеш чалавека, дапаможаш яму, запаліш у яго сэрцы надзею на дабро і справядлівасць.

Ніхто не спрачаецца: на аўтастанцыі білеты трэба браць у касе. Так усе і робяць. Але ж ёсць людзі старыя, хворыя, з малымі дзецьмі. Бывае, пасажыр проста спазніўся. Ды што там пералічваць. Розныя ў жыцці здараюцца выпадкі. Пастарайцеся зразумець чалавека і дапамагчы яму, паважаныя работнікі аўтастанцый, вадзіцелі аўтобусаў, усе, ад каго гэта залежыць. Не дапускайце, каб з-за інструкцыі, няхай нават вельмі строгай, плакалі людзі, як плакала з-за яе старэнькая Ганна Апанасаўна Мінак.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

ШТРЫШКІ

Не памяць, а бяспамяцтва

Маладая жанчына з хлопчыкам і дзяўчынкай прыпынілі крок ля помніка Леніну ў цэнтры горада. Маці паставіла дзетак бліжэй да пастамента і шчоўкнула фотаапаратам — на памяць для сямейнага альбома. Магчыма, яе саму ў дзяцінстве бацькі прыводзілі сюды: помнік жа стаіць з пасляваенных гадоў...

Падумалася: прыйдзе час, калі дзеці гэтай жанчыны стануць дарослымі і, пэўна, даведаюцца праўду пра "бессмяротнага правадыра". Пра тое, напрыклад, як у далёкім 1921 годзе, калі ў многіх губернях Паволжа і Урала мільёны людзей вымiралі з голаду, "дзядуля Ленін" з Троцкім праз агентаў Камінтэрна адпраўляў за мяжу, у краіны Еўропы і Амерыкі, дзесяткі тон золата і на мільёны залатых рублёў — брыльянтаў з рэквізаванай царскай казны (пра гэта нядаўна паведаміла расійскае тэлебачанне ў перадачы "Бриллианты для мировой революции").

Бальшавікі на чале са сваім правадыром змагаліся за перамогу сусветнай рэвалюцыі і не лічыліся са сродкамі. А што ў выніку? Трагедыя соцень мільёнаў людзей на абсягах велізарнай камуністычнай імперыі... Так што зусім не памяць, а бяспамяцтва прывялі да помніка тую жанчыну з дзецьмі, як было ў савецкую эпоху, якая ўсё ніяк не канчаецца.

«Паехалі, зямляк, у дзярэўню!»

Так гукнуў мне на вуліцы каржакаваты дзядуля, залазячы ў аўтамабіль свайго ўнука і кіруючыся ў вёску, дзе мы разам раслі. Я махнуў рукой, маўляў — зараз не магу, едзь адзін.

Ведаючы, што ён і ягоныя бацькі-калгаснікі калісьці добра размаўлялі па-беларуску ды яшчэ са шляхетным маўленнем, цяперашняе "дзярэўня" ў вуснах іх сына навяло мяне на задумку: апытаць тамтэйшых вясковых пенсіянераў (а іх засталося чалавек дванаццаць, пераважна жанчын), на якой мове яны размаўляюць. Гэта я і зрабіў, наведаўшы пазней родныя мясціны. Аказалася: амаль ўсе гавораць зараз на "трасянцы": *"здрастуйце", "прасядацель", "кладбішча", "забор", "лошаць"* і г.д.

Пазваніў у суседнюю вёсачку настаўніку-пенсіянеру, сваяку вядомай беларускай пісьменніцы Алены Васілевіч, якая вырасла там, увабрала ў памяць і душу моўнае багацце сваіх землякоў мінулага веку і ўвасобіла яго ў цудоўнай аповесці "Расці, Ганька!". На пытанне, ці ацалела ў яго вёсачцы штосьці з былога моўнага скарбу, настаўнік з сумам адказаў: "А нічога, усе карыстаюцца "трасянкай", не грэбуючы пры тым расійскімі мацюкамі. Няма таго, што раньш было: паўсюдная русіфікацыя..."

Ашчаднасць завяла бабулю ў бальніцу

У бабулі Хвядоры сёлета вельмі ўрадзілі слівы, на ўсіх чатырох дрэвах аж галлё гнулася. Не маючы колішняй увішнасці і трываласці, яна без одуму па падгнілай лесвічцы палезла здымаць слівы. Суседка пляснула рукамі:

— Хвядора, куды ты ў свае гады? Гукнула б падлеткаў, дала б па шакаладцы — і ўвесь клопат.

